Жукоўшчынская базавая школа

# “ПАЭТЫЧНЫЯ МУЗЫ”

На сцэне стаяць 3 сталы, засланыя абрусамі, на якіх у рамках стаяць партрэты пісьменнікаў, за сталамі - удзельнікі прадстаўлення.Гучыць музыка.
Выступленне суправаджаецца прэзентацыяй

**1 вядучы**:
Жукоўшчынская родная зямля:
Палі, азёры, паплавы,палеткі.
Прайдзіце Беларусь ад краю ў край –
Нідзе не знойдзеце вы край прыгожы гэткі.

**2 вядучы**: Дзятлава, Зачэпічы, Рабкі
Радзімы мілай родныя старонкі
Там людзі знакамітыя ўзраслі
Адтуль да творчасці натхненне ўзялі.

**1 вядучы:**
Вітаюць Вас навучэнцы Жукоўшчынскай базавай школы, у якім размяшчаецца музей “Літаратурная Дзятлаўшчына”. Музей мае літаратурны накірунак, адкрыўся ў 2005 годзе. У музеі арганізавана 11 экспазіцый.

**2 вядучы:** Прымаючы ўдзел ў раённым праекце “Свет школьных музеяў”, мы запусцілі свой праект “Школьны музей – цэнтр духоўнага выхавання асобы”. Сёння мы вам прадстаўляем адзін з этапаў дадзенага праекта – фрагмент літаратурнага салона “Паэтычныя музы паэтаў”

**Кіраўнік музея:**
Як дрэва каранямі мацуецца да зямлі, так і чалавек звязаны духоўнымі каранямі са сваёй малой радзімай, чэрпае адтуль свае сілы, жывіцца сокамі роднай зямлі, памнажае яе багацці.

**Муза асветы** народа, абароны яго правоў стала для Ігната Дварчаніна лёсавызначальнай.
Нездарма ў адным з сваіх вершаў ён пісаў :
Людцы! Паслухайце мужчыну.
Да сонца гніцесь як галіны.
Адно вы майце на сумленні
Свае карэнні.
Нават знаходзячыся ў канцлагеры, ён не забываецца пра свой святы абавязак – служыць Айчыне.

**Сцэнка.**
Чамаданчык, чамадан, скрынка, куфар. Гэтыя рэчы суправаджаюць чалавека на працягу ўсяго жыцця. Так сталася, што гэтыя рэчы і ў лёсе пісьменнікаў адыгралі вызначальную ролю.

Ігнат Дварчанін за сваю грамадскую дзейнасць, удзел у нацыянальна-вызваленчым руху на ўскраінах Расійскай імперыі , за культурна-асветную работу ў Дзятлаўскім павеце, працу ў якасці пасла ў польскім буржуазным сейме і стварэнне там беларускага пасольскага клуба, выступленні на мітынгах быў зняволены польскімі ўладамі на 8 гадоў турмы.

Усюды разам з ім вандраваў чамаданчык з падвоеным дном для захавання важных дакументаў. Гэты ж чамадан ён хацеў перадаць родным і ў апошнія дні свайго жыцця, знаходзячыся ў турме ўжо пасля абвінавачвання сталінскімі ўладамі ( яго ў 1932 годзе абмянялі як палітзняволенага).

Вось што ён піша ў адным з апошніх пісьмаў з Салавецкіх лагераў жонцы брата Ларывона Вользе Дзмітрыеўне Сманцэр:

**Сцэнка** ( Ігнат сядзіць за турэмным сталом)

" …Ожидаю также ответа на те вопросы, о которых я просил в том письме. Я хочу сделать так –передать Вам свой чемодан, а вы часть пошлете Иллариону, а часть вернете мне назад. Здесь очень трудно это сделать, как будет все готово, я напишу что и как.

С моим делом я не знаю – ничего не могу понять. Здоровье слабое- уже 10 дней и даже больше болею, так что бросил работу.

Передайте привет отцу и сестрам.

Ваш Игнатий"

Ігната Дварчаніна расстралялі , а зробленыя справы і вершы, напісаныя ім, помняць і сёння нашчадкі.

**Муза змагання** за волю ў родным краі, за вызваленне ад уціску натхняла паэтаў з "зачэпінскага гнязда" на смелыя справы і ўчынкі: яны ўдзельнічалі ў падпольнай камсамольскай рабоце за вызваленне Заходняй Беларусі ад панавання палякаў, за вызваленне ад фашызму ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**Сцэнка**

Слухаюць зводку Савінфармбюро і запісваюць на лісткі

Пятрусь Граніт:

Трэба напісаць шмат экземпляраў, бо заўтра кірмаш у Беліцы. Будзе многа народу. Хай ведаюць людзі, што Чырвоная Армія наступае, б'е фашысцкіх гадаў.

Васіль Струмень:

Правільна. Свята вялікае – мядовы Спас. Я заўтра на ровары ў Дзятлава пад'еду і там параскідаю лістоўкі. Няхай немцы бесяцца, што ім канец хутка.

Гарасім Прамень :

Я ж па нашай вёсцы прайдуся і ў Гезгалы загляну . На слупах павешу аб'явы. Той-сёй прачытае і другому перадасць.

Пятрусь Граніт:

Трэба і ў партызанскі атрад перадаць радасную навіну. Лягчэй ворага будзе біць, перамогу набліжаць. Пакладу я лістоўкі ў двайное дно чамаданчыка свайго на ноч, каб часам хто не нарваўся знянацку. Там нашы хлопцы на варце стаяць, пільнуюць, каб паліцаі не аб'явіліся.

**Кіраўнік музея: Вучні пачатковых класаў знаёмяцца з дзіцячай паэзіяй Петруся Граніта**

**Сцэнка:**

**Вучаніца 1.** Нас на ўроку чытання ў школьным музеі настаўніца ўчора пазнаёміла з паэтамі, што пішуць для дзяцей. І ведаеш, сярод іх ёсць наш зямляк з Зачэпічаў.

**Вучаніца 2.** І хто?

**Вучаніца 1**. Пятрусь Граніт. На самай справе ён – Іван Пятровіч Івашэвіч.

**Вучаніца 2**. А чаму тады Граніт?
**Вучаніца 1.** А гэта псеўданім.
Ён іменем такім свае вершы падпісваў,
Бо цвёрдым духам сваім быў вядомы ўсім.( падыходзіць 3 вучаніца)
**Вучаніца 3.**
Калі ён быў зусім малы, такі, як мы –
То зведаў беднасць і цяжкую працу.
Ад цяжкіх ран, прынесеных з вайны,
У 20-я гады ў яго памёр любімы тата.
**Вучаніца 1.**
Затым ён стаў падпольшчыкам і камуністам.
У турмах не адзін раз пабываў.
І ў гэты час упершыню ў газеце
Свой верш пра лета апублікаваў.
**Вучаніца 3**
У грозныя гады фашысцкае навалы
Пятрусь Граніт быў партызанскім сувязным.
І нават у такі складаны час
Ён вершаў ўсё ж не перастаў пісаць.
**Вучаніца 1**
Пасля вайны ён адвучыўся на настаўніка
І ў роднай вёсцы дзетак стаў вучыць.
Для іх пісаў ён вершы, байкі, казкі,
Каб весялей і цікавей было нам жыць.
**Вучаніца 3.**
Вось так з'явіўся зборнік для дзяцей "Сцяжынка",
Дзе шмат цікавых павучальных вершаў.
Мы па сцяжынцы гэтай смела крочым.
Яна настаўніцаю стала для нас першай.
**Вучаніца1**
Для захавання памяці нашчадкам
У Зачэпічах адкрылі помнік сціплы:
Васіль Струмень, Гарасім Прамень, Пятрусь Граніт-
Заходнебеларускія паэты.

**Вучаніца**: Гучаць і сёння вершы іх
"***Верабейчык" Петруся Граніта чытае Дар'я Махнач,***
***"Сцяжынку" Петруся Граніта чытае Дзіяна Штэйзель***.

**Муза исцеления души** Евгения Матвеева помогала ему лечить не только душевные, но и физические недуги людей. По профессии медик , по состоянию души – философ и поэт:
Монолог от имени поэта читает ученица:

Трудно сказать, кого на свете больше – тех, кто пишет стихи, или тех, кто их читает. Скорее всего, поровну. Это нечто вроде сообщающихся сосудов. Но без этого соединения, единения, сообщения не было бы поэзии. Равно как и человека. Ибо только ему – мало. Мало самому увидеть, удивиться, ошибиться, потерять, найти, заплакать, влюбиться. Он

хочет, должен, обязан – по велению сердца – сообщить об этом как об уникальнейшем открытии.

И что удивительно: все смотрят в ночное небо, все смотрят в ночное небо, все плачут, все влюбляются, теряют и находят, но – каждый по-своему. И сообщает каждый по-своему – песней, хлебом, храмом, танцем, стихами.

В этом сонме творений человеческого духа есть солисты и ансамбли, есть знаменитости и неизвестные, генералы и рядовые. Но здесь важна не степень, а конечный результат: песню поют, танец танцуют, хлебом почтуют, в храме молятся. Стихи же – читают. Без читателя стихи - как хлеб на поле и ещё не сжатый. Как храм еще в чертежах. Как песня шепотом, даже самим собой не услышанная. Без читателя стихи – в тюрьме. А стихам уже тесно, а стихи рвутся на волю:

А сердце, вынырнув из страха,
Полно любовью до краёв.
Безбожник я с душой монаха,
Стихи- монашество мое.

Надо ли выпускать стихи на волю, если за славой не гонишься, если жизнь отдана другому хлебу – медицине? Надо. Ибо свято место пусто не будет. Опубликованные стихи – стимул для рождения новых. Бессмысленно выращивать хлеб, зная, что его никто не съест.
Надо и потому, что в стихотворном многоголосье поэтический голос Е. Матвеева не затерялся.

**Кіраўнік музея**: Сказаць пра кожнага з пісьменнікаў можна шмат. Кожны з іх бачыць свет па-свойму і піша толькі аб сваім, але для усіх. Лейтматывам творчасці ўсіх пісьменнікаў Дзятлаўшчыны служаць словы Вячаслава Адамчыка, нашага земляка :

“Пісаў і пісацьму сваё жыта,сваю дарогу ў полі, маладую бярэзіну пры хаце, ціш, вечар і сваю маці з дзяружкаю зелля за плячыма.
Мой невялікі народ варты вялікае кнігі. Я гавару не толькі пра сябе . Я веру нашай літаратуры, на яе спадзяюся. Шчаслівы буду , калі на ніве беларускай літаратуры ўзыдзе і маё зярнятка.”

Не толькі зярняткамі , але каласамі і цэлай нівай закаласіла творчасць нашых землякоў-пісьменнікаў, якую нам толькі і трэба, што пазнаваць , вывучаць, адкрываць. Запрашаем і вас да духоўнага спазціжэння і новых адкрыццяў.

**Гучыць мелодыя песні .**

**1 вядучы:**
Праходзяць гады, і зыходзім мы,
Але пакідаем нашых спраў мы вартасць.
Не кожны трапіць у верш ці ў аповесць,
Але і слова, і музейны экспанат раскажуць аб значнасці зробленых спраў.

**2 вядучы:**
Школьны музей дарагі для нас усіх:
У ім памяць пра лёсы людскія мы беражом.

Запрашаем усіх да нас:
“Літаратурная Дзятлаўшчына” чакае вас.